





НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ У БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, ЗА МІР, ДЭМАКРАТЫЮ І САЦЫЯЛІЗМ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).


*ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Гомельскі Універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 15 (254) | Субота, 30 красавіка 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


## ПЕРШАМАЙ ЮБІЛЕЙНАГА ГОДА

Уся Краіна Саветаў у святочным убранні. З пачуццём гордасці і радасці за сваю Радзіму, яе працалюбівы народ, арганізатара ўсіх нашых перамог — родную Камуністычную партыю савецкія людзі сустракаюць Першамай. Сёлета гэта свята — асаблівае. Яно будзе адзначацца пасля таго, як працоўныя калектывы дасягнулі ўжо значных здабыткаў у выкананні гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС, у год, калі наша краіна і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва свету рыхтуюцца дастойна адзначыць слаўны юбілей Вялікага Кастрычніка.

Сёлетні Першамай знамянальны і тым, што ён супаў з важнай палітычнай кампаніяй — падрыхтоўкай да выбараў у абласныя, гарадскія, раённыя, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Заўтра па ўсёй краіне і за яе межамі пройдуць святочныя маніфестацыі. Людзі працы будуць рапартаваць аб сваіх дасягненнях, аб непахіснай рашучасці мацаваць мір на зямлі, дамагацца ШЧАСЦЯ, РОЎНАСЦІ і БРАТЭРСТВА ўсіх народаў планеты.

У гэтыя перадсвяточныя дні незвычайна памаладзеў і папрыгажэў наш родны Гомель. У маляўнічым убранні вуліцы і плошчы, своеасаблівы святочны каларыт стварае першая зяляніна.

Заўтра многія тысячы гамяльчан пройдуць па плошчы, якая носіць дарагое ўсім нам імя Уладзіміра Ільіча Леніна. У сваіх працоўных рапартах дэманстранты раскажуць, з якімі поспехамі яны сустрэлі Міжнародны дзень салідарнасці працоўных, які падарунак рыхтуюць слаўнаму юбілею Савецкай улады.

Па цэнтральнай плошчы горада пройдзе і шматтысячная калона нашага ўніверсітэта — сапраўднай кузні кадраў, вядучай вышэйшай навучальнай установы беларускага Палесся. Мы будзем рапартаваць аб тым, што сёлета ўніверсітэт выпускае для народнай гаспадаркі краіны яшчэ адзін вялікі атрад маладых спецыялістаў — 810 чалавек. Многія з іх прыйдуць працаваць у калектывы прамысловых прадпрыемстваў, навуковых арганізацый і падраздзяленняў, у школы ардэнаносных Гомеля і Гомельшчыны.

Мы будзем рапартаваць аб тым, што ва ўніверсітэце вядзецца актыўная работа для павышэння якасці ведаў студэнтаў, іх прыцягнення да плённай навукова-даследчай і грамадскай дзейнасці, аб усё ўзрастаючым укладзе вучоных і выкладчыкаў ГДУ ў развіццё айчыннай навукі, аб праводзімых імі фундаментальных даследаваннях, якія маюць вялікае значэнне для народнай гаспадаркі.

Байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў скажуць аб сваім аднадушным жаданні азнаменаваць юбілейны для Радзімы год новымі, яшчэ больш значнымі дасягненнямі на важнейшых аб'ектах трэцяга, працоўнага семестра.

У гэты перадсвяточны дзень рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта горача віншуюць вас, дарагія таварышы, з Першамаем юбілейнага года, жадаюць вам добрага настрою, моцнага здароўя і поспехаў у вучобе і працы на карысць нашай Айчыны!

У. КАЗЛОЎ,
сакратар парткома.

## АБМЕРКАВАНА НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

У апошні час усё часцей сталі практыкавацца сумесныя пасяджэнні партыйнага камітэта і Вучонага савета ўніверсітэта, на парадак дня якіх выносяцца найбольш актуальныя і важныя пытанні.

Аналагічнае пасяджэнне адбылося пазаўчора. Па-дзеламу абмеркаваны пытанні «Аб рабоце геалагічнага факультэта ў святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС» і «Аб стане і мерах паляпшэння ўнутрыўніверсітэцкага кантролю за якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў», з дакладамі па якіх выступілі дэкан геалагічнага факультэта дацэнт Ю. Ф. Хадакоўскі і прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Л. А. Шамяткоў.

Па абмеркаваных пытаннях прыняты адпаведныя пастановы.

## УШАНАВАННЕ ЮБІЛЯРА

Напярэдадні Першамайскага свята споўнілася 50 гадоў загадчыцы падрыхтоўчага аддзялення Л. Д. Ваўкагон. З нагоды знамянальнага юбілею Людмілу Дзмітраўну горача віншавалі на сумесным пасяджэнні парткома і Вучонага савета ўніверсітэта.

Як стараннага работніка і клапатлівага выхавацеля Л. Д. Ваўкагон характарызаваў сакратар парткома У. В. Казлоў і ўручыў ёй памятны адрас. Рэктар універсітэта Б. В. Бокуць абвясціў загад па рэктарату аб аб'яўленні Л. Д. Ваўкагон падзякі і ўзнагароджанні яе Ганаровай граматай.

Ад прафсаюзнай арганізацыі юбіляру быў уручаны памятны падарунак.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, дэканат і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры рускай мовы ЛАШКЕВІЧА Аляксандра Іванавіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

* * *

Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, дэканат і студэнты механіка-матэматычнага факультэта горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры матэматычнага аналізу РАМАНАВА Уладзіміра Аляксандравіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.



У маляўнічым убранні перад святочная плошча імя У. І. Леніна, па якой заўтра пройдуць калоны дэманстрантаў Гомеля.

# «СОНЕЙКА»—ЛАЎРЭАТ «ЧЫРВОНАЙ ГВАЗДЗІКІ»

**Нядаўна па ініцыятыве савета Віцебскага гарадскога студэнцкага клуба і гаркома камсамола ў горадзе на Дзвіне праводзіўся музычны конкурс «Чырвоная гваздзіка», прысвечаны слаўнаму юбілею — 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. У ім прымалі ўдзел вакальна-інструментальныя ансамблі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі, а таксама гарадоў Смаленска, Вялікія Лукі. Права абараняць гонар нашага універсітэта на конкурсе было прадастаўлена адзінаму ў рэспубліцы жаночаму вакальна-інструментальнаму ансамблю «Сонейка», створанаму на базе біялагічнага факультэта — пераможцу Ўсесаюзнага фестывалю самадзейнай народнай творчасці.**

**Нягледзячы на тое, што ў конкурсе прымалі ўдзел вакальна-інструментальныя ансамблі з добрым выканаўчым майстэрствам, дзяўчаты з «Сонейка» і на гэты раз змаглі прадэманстраваць сваю высокую культуру выканання і ўвайсці ў тройку лаўрэатаў «Чырвонай гваздзікі».**

**Лаўрэатам уручаны дыпломы і прызы гаркома камсамола, камітэтаў камсамола віцебскіх ВНУ.**

*ПРЫКМЕТЫ ЧАСУ*

# КОЛЬКІ КАШТУЕ АДУКАЦЫЯ?

Мы, савецкія людзі, успрымаем як норму свой высокі матэрыяльны дабрабыт, неабмежаваныя па сутнасці справы магчымасці задавальняць духоўныя запатрабаванні. Вельмі важна пры гэтым памятаць, з чаго пачынала 60 гадоў назад наша краіна, карысна параўнаць цяперашні дабрабыт нашага народа са становішчам працоўных у краінах капіталу.

Аналізуючы становішча народнай адукацыі ў царскай Расіі, У. І. Ленін у 1913 годзе з горыччу адзначаў, што ў Еўропе няма такой іншай краіны, дзе б народ быў так абрабаваны, так пазбаўлены доступу да адукацыі і культуры. Амаль тры чвэрці насельніцтва не ўмела ні пісаць, ні чытаць. Сярод многіх народаў ускраін Расійскай імперыі грамату ведалі літаральна лічаныя людзі. Амаль 40 народаў і народнасцей Расіі не мелі нават сваёй пісьменнасці.

Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі зрабіла людзей працы гаспадарамі ўсіх створаных імі матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, адкрыла ім шлях да вяршынь ведаў. Зараз у нашай краіне з кожнай тысячы працуючых 767 маюць вышэйшую і сярэднюю (поўную і няпоўную) адукацыю. Каб ацаніць значэнне гэтага факта, нагадаем, што і зараз на нашай планеце налічваецца 700 мільёнаў непісьменных. Зразумела, большая іх частка прыпадае на краіны, якія доўгія гады былі калоніямі імперыялістчных дзяржаў. Аднак і ў такіх развітых капіталістычных краінах, як ЗША, Англія і іншыя, мільёны людзей застаюцца непісьменнымі.

Адукацыя, асабліва вышэйшая, у сучасным капіталістычным свеце практычна недаступна працоўнай моладзі з-за непамерна высокай платы за навучанне. Напрыклад, у радзе ўніверсітэтаў ЗША яна дасягае пяці-шасці тысяч долараў у год. У Японіі з 405 універсітэтаў і інстытутаў у распараджэнні дзяржавы і муніцыпальных улад знаходзіцца толькі 109, астатнія 296 належаць прыватным прадпрыемцам, якія ў пагоні за прыбыткам сістэматычна павышаюць плату за навучанне. Нават за ўступныя экзамены неабходна плаціць буйныя сумы: ў дзяржаўных універсітэтах — 5 тысяч, у прыватных — да 10 тысяч іен. Але і гэтыя сумы выглядаюць мізэрнымі ў параўнанні з платай за самую вучобу.

На першым курсе прыватнага ўніверсітэта японскі студэнт павінен унесці «ўступны ўзнос» — у сярэднім 73 тысячы іен, затым плату за навучанне на працягу акадэмічнага года — у сярэднім 132 тысячы іен. Акрамя гэтага, ён плаціць за карыстанне абсталяваннем, лабараторыямі, кніжным фондам і г. д. — у сярэднім яшчэ 81 тысячу іен у год. Усё гэта сярэднія даныя, што ж датычыць, напрыклад, прыватных медыцынскіх інстытутаў Японіі, то агульная сума плацяжоў, якая спаганяецца там з першакурснікаў, складае да 1,5 мільёна іен. Гэта вышэй, чым сярэднегадавы заработак паловы японскіх рабочых і служачых.

Так, цяжкі лёс японскіх студэнтаў — выхадцаў з пралетарскіх і паўпралетарскіх сем'яў. Вучобу ў сценах ВНУ, калі і пашанцуе яе пачаць, ім даводзіцца сумяшчаць з пабочнымі заробткамі. Такія студэнты — гэта адна са шматлікіх катэгорый бедных пластоў сучаснага японскага грамадства.

Прамой процілегласцю капіталістычнай з'яўляецца сацыялістычная сістэма вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Мы, савецкія людзі, так прывыклі да многіх даброт, што нават у афіцыйных дакументах часам называем іх бясплатнымі, хаця бясплатныя яны толькі для нас, а дзяржаве абыходзяцца ў вялікія сумы. У нашай краіне матэрыяльнае становішча ні аднаму чалавеку не можа перагарадзіць дарогу да вышэйшай адукацыі. Было б толькі жаданне вучыцца — расходы бярэ на сябе дзяржава. Прычым, студэнтам, якія добра паспяваюць, штомесячна выплачваецца дзяржаўная стыпендыя. Тым, хто асабліва адчувае патрэбу, аказваецца дапамога з рэктарскага фонду. У 1975 годзе звыш 75 працэнтаў студэнтаў беларускіх ВНУ атрымлівалі стыпендыі.

Канстытуцыяй СССР і Асновамі заканадаўства аб народнай адукацыі замацаваны вялікія матэрыяльныя гарантыі і правы на адукацыю савецкім грамадзянам. Акрамя бясплатнасці ўсіх відаў навучання, ім дадзена права бясплатнага карыстання аўдыторыямі, лабараторыямі, кабінетамі, вылічальнымі цэнтрамі, бібліятэчнымі фондамі, чытальнымі заламіі і іншымі тэхнічнымі сродкамі навучання, а таксама спартыўнымі збудаваннямі, абсталяваннем, інвентаром.

Канешне, кошт навучання, бясплатнага для студэнтаў, розны і залежыць ад формы навучання, абранай спецыяльнасці і працягласці вучобы.

У 1970 годзе затраты дзяржавы на навучанне складалі ў сярэднім 800 рублёў на аднаго студэнта беларускіх ВНУ і 460 рублёў на аднаго навучэнца тэхнікума нашай рэспублікі. За гады дзевятай пяцігодкі, дзякуючы праведзеным па пастановах партыі і ўрада мерапрыемствах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, узраслі расходы з дзяржаўнага бюджэту на ўтрыманне ВНУ і тэхнікумаў. Так, з 1 верасня 1972 года была павышана стыпендыя студэнтам у сярэднім на 25 працэнтаў, навучэнцам тэхнікумаў — на 50 працэнтаў, павышана заработная плата выкладчыкам ВНУ (якія не маюць вучоных ступеняў) і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

За гады пяцігодкі значна пашырылася матэрыяльна-тэхнічная база. У радзе навучальных устаноў пабудаваны новыя карпусы, інтэрнаты, сталовыя, спартыўна-аздараўленчыя лагеры, створаны студэнцкія прафілакторыі. На новыя аб'екты выдзелены дадатковыя штаты вучэбнага і гаспадарча-абслугоўваючага персаналу. Акрамя таго, штогод растуць асігнаванні на набыццё дарагога вучэбна-лабараторнага абсталявання, электронна-вылічальных машын і іншых тэхнічных сродкаў навучання. У выніку ў 1976 годзе расходы на навучанне аднаго студэнта ў ВНУ рэспублікі склалі ў сярэднім 1000 рублёў, а на аднаго навучэнца тэхнікума— 630 рублёў.

У бягучым 1977 годзе па сістэме нашага міністэрства будзе затрачана ў сярэднім 5,3 мільёна рублёў на ўтрыманне адной ВНУ і 600 тысяч рублёў — адной сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы.

Неабходна адзначыць, што расходы на вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю не абмяржоўваюцца толькі дзяржбюджэтнымі асігнаваннямі. Многія навучальныя ўстановы маюць у сваім распараджэнні значныя сумы спецыяльных (пазабюджэтных) сродкаў. Гэта перш за ўсё перавышэнне даходаў над расходамі ад выканання гаспдагаворных навукова-даследчых работ, прыбыткі ад вучэбна-вытворчых майстэрань, сродкі прафсаюзных арганізацый і інш.

Гэтыя крыніцы сродкаў выкарыстоўваюцца для набыцця новага абсталявання, на рамонт, арганізацыю спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў, адпачынак і лячэнне студэнтаў у вузаўскіх санаторных прафілакторыях.

Неабходна дадаць да ўсяго сказанага, што большасць нашых студэнтаў і навучэнцаў забяспечваюцца добра абсталяванымі і амаль бясплатнымі інтэрнатамі (студэнты плацяць па паўтара рубля, а навучэнцы — 70 капеек у месяц).

Магчыма, не прынята ў газетных артыкулах прыводзіць такую вялікую колькасць лічбавых даных, але вельмі ўжо пераканаўча сведчаць яны аб вялікіх клопатах партыі і дзяржавы, якімі акружана моладзь нашай краіны.

**Ф. ДЗЯДКОЎ,**
**начальнік планава-фінансавага ўпраўлення Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.**

**(Перадрукавана ў перакладзе з газеты «Советская Белоруссия»).**

*Для вясёлага перапынку*

# ДЭКАН

**Агульнавядома, што «дэканам» называецца чалавек, які заклікаIны замяніць студэнту і бацьку, і маці. І нават бабулю і дзядулю. Такая ўжо ў яго пасада.**

**Функцыі сучаснага дэкана значна шырэйшыя, чым сама назва гэтага тэрміна. Слова «дэкан» паходзіць ад старажытнагрэчаскага «дэка», што азначае дзесяць і перакладаецца нечакана проста — «дзесятнік».**

**«Як жа так?!» — здзівіцеся вы. — Зараз жа няма такіх шчаслівых дэканаў, якія маюць усяго толькі дзесяць студэнтаў». І вы, безумоўна, маеце рацыю...**

**У старажытнарымскім войску «дэканамі» называліся камандзіры менавіта дзесяці легіянераў. Дэканы падтрымлівалі строгую дысцыпліну, але не прымушалі сваіх падапечных здаваць залікі і экзамены. Калі, канешне, не ўлічваць, гаворачы па-сучаснаму, залікаў па фізвыхаванню і, так сказаць, грамадзянскай абароне.**

Сярэднія стагоддзі... Тады ў манастырах «дэканам» называўся старшы манах, якому падначальваліся дзесяць малодшых. І калі гэта слова перайшло ва ўніверсітэты, асаблівай неадпаведнасці не было. У сярэднія стагоддзі цяга да ведаў была дастаткова памяркоўнай: на факультэце ў той час вучылася па пяць, па сем студэнтаў, а ў асобных выпадках нават дваццаць.

Мінулі стагоддзі. Студэнцкая армія бесперапынна расла. І сучасны дэкан ужо не «дзесятнік», а «сотнік», а то і больш. Але як і манастырскім дэканам, яму даводзіцца глядзець, каб яго «паства» не вельмі грашыла...

Рабочы дзень дэкана практычна не абмежаваны. Кола інтарэсаў таксама. У прыватнасці, яму даводзіцца чытаць тлумачальныя запіскі студэнтаў і пры гэтым не страчваць пачуцця гумару. А запіскі бываюць розныя. Вось, напрыклад, такія: «Учора я прапусціў лекцыю па фізіцы, таму што да 14 гадзін хварэў грыпам». Або: «Тыя лекцыі, якія я прапусціла, прашу лічыць несапраўднымі, таму што я проста пераблытала расклад».

Памятаеце, у свой час Уладзімір Маякоўскі пісаў:

«Я бы в летчики пошел—
Пусть меня научат!».

І пералічыў яшчэ з дзесятак прафесій, якія яго вабілі. Але ў дэканы Маякоўскі чамусьці не прасіўся.

## Спорт

## ПАЦВЕРДЗІЛІ ВЫСОКІ КЛАС

У Жытоміры праведзены розыгрыш Кубка СССР па веславанню на байдарках і каноэ. У спаборніцтвах паспяхова выступілі беларускія спартсмены. Рэпутацыю мацнейшых і на гэты раз пацвердзілі студэнт факультэта фізічнага выхавання нашага ўніверсітэта Віктар Вераб'ёў і яго напарнік мінчанін Мікалай Астапковіч. Дуэт чэмпіёнаў свету ў байдарцы-двойцы перамог на дзвюх дыстанцыях — 500 і 1000 м.

## НА БАРЦОЎСКІМ ДЫВАНЕ

Працягваюцца спаборніцтвы па праграме VIII круглагадовай універсіяды. Днямі выявілі мацнейшых барцы ўніверсітэта. У спаборніцтвах, якія прайшлі на высокім арганізацыйным узроўні і выклікалі вялікую цікавасць аматараў гэтага віду спорту, прынялі ўдзел 64 маладыя асілкі. Пасля праведзеных паядынкаў пераможцамі ў сваіх вагавых катэгорыях сталі: студэнт эканамічнага факультэта першаразраднік А. Дваркоўскі, другакурснік геалагічнага факультэта спартсмен 2-га разрада С. Халюкоў, майстар спорту А. Грамыка (эканамічны ф-т), кандыдат у майстры спорту У. Новікаў (геалагічны ф-т), студэнты факультэта фізічнага выхавання кандыдат у майстры спорту В. Бандарэнка (82 кг), першаразраднік М. Бурдзелеў (90 кг), кандыдат у майстры спорту К. Федзюкевіч (100 кг). У цяжкай вагавай катэгорыі вышэйшую ўзнагароду заваяваў студэнт геалагічнага факультэта першаразраднік В. Высоцкі.

У камандным заліку месцы размеркаваліся наступным чынам: факультэт фізвыхавання — 111 ачкоў, геалагічны ф-т—108, мехмат—88, эканамічны—58, фізічны — 31, біялагічны—25, гістфіл—13.

**С. ДЗЕГЦЯРОЎ,**
**суддзя спаборніцтваў.**



**НА ЗДЫМКУ: паядынак барцоў цяжкай вагавай катэгорыі двух Уладзіміраў—ТРАЦЭЎСКАГА і ВЫСОЦКАГА (зверху), у якім перамог апошні.**

Фота **В. Садоўскага.**

## Высокія вынікі

На стадыёне «Лакаматыў» два дні праходзілі спаборніцтвы па праграме асабіста-каманднага першынства ДССТ «Буравеснік». Сур'ёзным «сапернікам» юных спартсменаў быў дождж. Нягледзячы на гэта ў радзе відаў былі паказаны высокія вынікі. Добра зарэкамендавалі сябе выхаванцы ДЮСШ пры спартыўным клубе нашага ўніверсітэта, якіх трэніруе С. Жываў. У складаных умовах Уладзімір Калеснікаў пераадолеў планку на вышыні 200 см, а Люда Герасіменка — на вышыні 155 см. У скачках у даўжыню Лена Пятрова паказала 5 м 43 см. Усе трое юных спартсменаў сталі чэмпіёнамі студэнцкага таварыства рэспублікі па сваёй узроставай групе.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 04573

**«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.**

**Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2, П. 4-8, т. 6-27-71. Фармат 600× 420 мм. Тыраж 2000 экз.**

Заказ 3002